**ВОДЗЫЎ**
**афіцыйнага апанента**
на дысертацыю Ненадаўца Ягора Аляксеевіча
«Водная прастора ў беларускім фальклоры:
семантыка, сімволіка, функцыянальнасць»,
прадстаўленую на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка

**1. Адпаведнасць зместу дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны**

Дысертацыя Я. А. Ненадаўца адпавядае спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка і галіне – філалагічныя навукі, па якіх прадстаўлена да абароны.

**2. Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Дысертацыя Я. А. Ненадаўца прысвечана цікавай і недастаткова распрацаванай у беларускай фалькларыстыцы тэме, звязанай з адной з асноўных стыхій светабудовы – вадой, якая, паводле касмаганічных легенд, увасабляла першасны хаос і з якой пачала фарміравацца сусветная прастора.

Актуальнасць дысертацыйнай работы вызначаецца тым, што, па-першае, праведзена кваліфікаванае даследаванне народных вераванняў пра водную прастору, што знайшлі адлюстраванне ў абраднасці выклікання дажджу, юр’еўскім абрадзе першага выгану жывёлы на пашу, сямейнай абраднасці, замовах, чарадзейных казках, малых фальклорных жанрах і інш.; па-другое, Я. А. Ненадаўцам прапанаваны новы шматаспектны падыход да вывучэння семантыкі, сімволікі і функцыянальнасці вады (воднай прасторы) у кантэксце розных жанраў беларускага фальклору, што дазволіла глыбей раскрыць і ўзбагаціць сістэму ўяўленняў нашых продкаў пра навакольны свет.

Праведзенае саіскальнікам комплекснае вывучэнне сістэмы народных вераванняў, звязаных з вадой і ўвасобленых у розных жанрах беларускага фальклору, пацвярджае актуальнасць і навуковую навізну прадмета дысертацыйнага даследавання.

Дысертацыя Я. А. Ненадаўца адпавядае прыярытэтным кірункам навуковых даследаванняў, прысвечаных тэарэтычнаму асэнсаванню традыцый беларускай вусна-паэтычнай творчасці, іх месца ў славянскім свеце і ролі ў фарміраванні менталітэту беларусаў, суадносін агульнаэтнічнага і рэгіянальна-лакальнага ў фальклоры, і выканана ў межах Дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”.

**3. Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Дысертацыйная работа Я. А. Ненадаўца з’яўляецца спецыяльнай абагульняючай навуковай працай і вызначаецца навізной прапанаванага ім кірунку даследавання. Упершыню ў айчыннай фалькларыстыцы праблема тэарэтычнага асэнсавання воднай прасторы разгледжана комплексна.

Сістэматызаваны і прааналізаваны значны пласт фактычнага фальклорна-этнаграфічнага і міфалагічнага матэрыялу (апублікаванага, архіўнага і ўласна запісанага), звязанага з увасабленнем вобраза вады ў многіх фальклорных жанрах. Аўтарам дысертацыі зроблены абгрунтаваныя высновы адносна спрадвеку сфарміраваных у народзе паважлівых адносін да воднай стыхіі незалежна ад добрых або суровых вынікаў яе ўздзеяння на чалавека, а таксама абавязковага выканання традыцыйна ўстойлівых правіл і забарон, шырока адлюстраваных у сістэме народных вераванняў, абумоўленых адметнай спецыфікай кожнага з фальклорных жанраў.

Навуковая навізна даследавання Я. А. Ненадаўца заключаецца ў тым, што дысертантам дадзены змястоўныя адказы на пытанні па павер’ях пра ваду ў абрадзе выклікання дажджу і сямейнай абраднасці, разгледжана семантыка “жывой” і “мёртвай” вады ў чарадзейных казках, прааналізавана функцыянальнасць вобраза вады ў замовах, падкрэслены яе лекавыя, ачышчальныя ўласцівасці, а таксама здольнасць замоўленай вады ўтрымліваць у сабе “таямнічую (гаючую) сілу” ўздзеяння (с. 66). Саіскальнік упершыню выявіў аксіялагічны складнік вобраза вады ў малых фальклорных жанрах, падкрэсліўшы, з аднаго боку, адлюстраваныя ў іх прадукавальныя ўласцівасці вады (спрыянне ўраджайнасці), а з другога боку, звязаны з вобразам вады высокі патэнцыял маральна-этычных якасцей, разам з тым указаў і на функцыю прадказання дажджу, што знайшло адлюстраванне ў тэкстах парэмій.

Дысертантам прадстаўлены навукова абгрунтаваныя вывады па семантыцы, сімволіцы і функцыянальнасці вады, вобраз якой атрымаў паэтычнае ўвасабленне ў многіх фальклорных жанрах вусна-паэтычнай творчасці беларусаў.

Сфармуляваныя ў дысертацыі навуковыя палажэнні маюць дастатковую ступень навізны і абгрунтаваны ўсебаковым аналізам фальклорных матэрыялаў, выкарыстаннем сучасных навуковых метадаў. Варта адзначыць, што навуковая навізна дысертацыі абумоўлена і тым, што палявыя запісы, зробленыя саіскальнікам, упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.

У першай главе “Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы даследавання вобраза вады” Я. А. Ненадавец, засяроджваючы ўвагу на зборніках фалькларыстаў XIX – пачатку XX стст. (П. Шэйн, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, А. Багдановіч, А. Сержпутоўскі і інш.), якія былі пачынальнікамі ў справе сістэмнага збору і функцыянальна-семантычнага аналізу воднай прасторы ў беларускай вусна-паэтычнай творчасці і ў працах якіх мелі месца звесткі пра народную метэаралогію, выяўляе важныя і цікавыя моманты, звязаныя з сімволікай і функцыянальнасцю вады.

Дысертант адзначае, што да праблемы тэарэтычнага асэнсавання асобных аспектаў, звязаных з воднай прасторай у беларускім фальклоры, звярталіся некаторыя фалькларысты (І. Швед, В. Шарая, Л. Салавей, Т. Рабец, А. Ненадавец, Т. Кухаронак і інш.), але спецыяльнага комплекснага навуковага даследавання, прысвечанага семантыцы, сімволіцы і

функцыянальнасці воднай прасторы ў беларускім фальклоры, праведзена не было.

Саіскальнікам абагульнены і асэнсаваны асноўныя палажэнні распрацовак па семантыцы воднай прасторы не толькі беларускіх збіральнікаў і фалькларыстаў, але і замежных даследчыкаў. Праведзены Я. А. Ненадаўцам гістарыяграфічны агляд характарызуе аўтара як прафесійна падрыхтаванага спецыяліста-фалькларыста, здольнага аб'ектыўна ацаніць уклад вучоных у гісторыю вывучэння акрэсленай праблемы, самастойна вызначыць неабходныя метадалагічныя падыходы з улікам характару і спецыфікі вывучанасці аб'екта даследавання.

Другая глава дысертацыі “Семантыка і сімволіка вады ў традыцыйным фальклоры беларусаў” прысвечана тэарэтычнаму асэнсаванню вобраза вады ў абрадзе выклікання дажджу і сямейнай абраднасці беларусаў, а таксама ў чарадзейных казках і замовах. Што да першага параграфа, то дысертант палічыў неабходным засяродзіць найперш увагу на абрадавай з'яве выклікання дажджу. Сістэмна прадстаўленыя аўтарам матэрыялы па абраднасці выклікання дажджу, несумненна, пашыраюць не толькі геаграфію запісаў пра многія формы гэтай унікальнай язычніцкай з'явы, але і дапаўняюць агульную карціну ўсходнеславянскай абраднасці выклікання дажджу новымі беларускімі матэрыяламі. На факт сціпласці спецыяльнай літаратуры па гэтым абрадзе ва ўсходнеславянскім фальклоры звяртаў увагу ў свой час Мікіта Ільіч Талстой. Варта адзначыць, што ў гэтых адносінах прэзентаваны дысертантам у параграфе “Семантыка і знакавасць воднай прасторы ў сферы каляндарнай абраднасці” новы фактычны матэрыял, у тым ліку і ўласна запісаны, узбагачае калекцыю запісаў па ўсходнеславянскай абраднасці выклікання дажджу. Прадстаўленыя ў дадатку матэрыялы, запісаныя аўтарам дысертацыі ў вёсках Боркі, Дабраслаўка, Новы Двор, Чухава, Ботава, Вяз і інш. Пінскага раёна, уяўляюць цікавасць і ўпершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак. Заслугоўваюць увагі назіранні і развагі аўтара над фактычнымі матэрыяламі, звязанымі з сімволікай вады ў сямейна-абрадавай паэзіі. Дысертант, абапіраючыся на аўтэнтычны фальклорна-этнаграфічны матэрыял, тлумачыць, напрыклад, сутнасць традыцыйнага звычаю палівання вадой на рукі ўдзельнікаў пахавальнай цырымоніі або іх абавязковага мыцця кожным прысутным.

Функцыю магічнага ачышчэння вадой з мэтай засцярогі ад небяспечнага ўздзеяння духаў памерлых Я. А. Ненадавец падмацоўвае як архіўнымі матэрыяламі, так і ўласна запісанымі ў вёсках Боркі і Чухава Пінскага раёна. Навукова каштоўнымі з'яўляюцца адзначаныя дысертантам звесткі наконт спецыяльнага ручніка, якім прапаноўвалі кожнаму з прысутных абавязкова выцерці рукі перад памінальным абедам. Саіскальнік удакладняе, што менавіта з гэтым ручніком, які ў народнай свядомасці набываў негатыўную сімволіку, хадзілі на другі дзень “будзіць нябожчыка” і вешалі гэты ручнік “на магільным крыжы” (с. 37). Паводле мясцовай народнай традыцыі, гэта трэба было зрабіць абавязкова, каб засцерагчы членаў сям'і ад смерці.

Я. А. Ненадавец засяроджвае пільную ўвагу і на іншых абрадах жыццёвага цыкла, напрыклад, радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, і прыводзіць важкія аргументы на карысць версіі аб уяўленнях пра ваду як ачышчальную стыхію, што і прадвызначыла яе шырокае выкарыстанне.

Навукова абгрунтаванымі з'яўляюцца высновы Я. А. Ненадаўца аб характары функцыянавання "жывой" і "мёртвай" вады ў чарадзейных казках. Аўтар, падкрэсліваючы наяўнасць матыву смерці і выратавання героя ў чарадзейных казках, прыводзіць аргументы, звязаныя са здольнасцю менавіта "жывой" вады вылечваць, аднаўляць сілы, вяртаць жыццё. На с. 44 дысертант, абапіраючыся на тэарэтычныя і фактычныя крыніцы, даказвае здольнасць вады да "вылячэння, ажыўлення, загойвання цяжкіх ран". Саіскальнік паказвае і тыя сілы, што дапамагаюць у розных сітуацыях здабыць ваду, якая выступае для герояў у якасці крыніцы папаўнення сіл, набыцця фізічных здольнасцей. У якасці такіх сіл, напрыклад, могуць выступаць іншыя стыхіі, персаніфікаваныя навальнічныя іпастасі, вобразы народнай дэманалогіі, арнітаморфныя персанажы і інш. (с. 44).

Праведзены Я. А. Ненадаўцам аналіз казачных сюжэтаў дазволіў аўтару раскрыць многія аспекты, звязаныя з "жывой" вадой: неўсвядомленае набыццё героем багатырскай сілы праз "жывую" ваду, дзякуючы сітуацыі, падробленай чараўнікамі; спазнанне сакрэту "жывой" вады праз камунікацыі са "старым дзядулькам", "сівой бабулькай", незнаёмым сустрэчным; атрыманне героем сілы праз захаванне казачных прыцыпаў чарговасці і трохкратнасці ўжывання вады і інш.

Заслугоўваюць увагі абагульненні аўтара, зробленыя на аснове глыбокага асэнсавання казачных сюжэтаў і матываў, звязаных з вадой, што датычацца "міфічна-небяспечных мясцін з "нежывымі" азёрамі, "мёртвымі" рэкамі, атрутнымі калодзежамі, якія атаясамліваліся з "мёртвай" вадой і з'яўляліся крыніцай аднаўлення сіл тых істот, што змагаліся з героямі-асілкамі чарадзейных казак. Дысертант аналізуе і тыя сюжэты чарадзейных казак, у якіх маюць месца розныя станы герояў, "выкліканыя ўздзеяннем" такіх фактараў, як "сацыяльных, псіхалагічных, рэлігійных" (с. 50).

Правамернай з'яўляецца акцэнтацыя ўвагі дысертанта на тэкстах чарадзейных казак, у якіх гаворыцца не проста пра выратаванне чалавека пры дапамозе вады ў цяжкія моманты жыцця, але і ў спрыянні яму ў будзённых справах.

Я. А. Ненадавец у параграфе "Комплекс "жывая-мёртвая" вада ў чарадзейных казках" паслядоўна рэалізуе важныя задачы: па-першае, раскрыццё асаблівасцей светапогляду продкаў, у свядомасці якіх водная стыхія з'яўлялася важным элементам наіўна-міфалагічнай светабудовы; па-другое, выяўленне філасофскай скіраванасці катэгорыі "жыццё" ў суадносінах з семантыкай вады ў чарадзейных казках. Як слушна заўважае дысертант, "жыццёвая плынь" <…> не спыняецца ні ў берагах ракі, ні ў рэальнасці" (с. 54).

У параграфе "Прэзентацыя вады ў беларускіх замовах" дысертант, аналізуючы тэксты замоў, тлумачыць, чым абумоўлена ў іх матывацыя звароту да вады. Як слушна адзначае аўтар, з двума супрацьлеглымі

кампанентамі “вада ў руху” і “заміранне вады” звязана станоўчая і адмоўная семантыка. Саіскальнік паслядоўна характарызуе функцыі вады ў замоўных формулах (лекавая, засцерагальна-ачышчальная, прадукавальная і функцыя медыятара той ці іншай магічнай сілы, скіраванай на пазбаўленне ад хваробы), пры гэтым падкрэслівае, што асаблівы эфект уздзеяння мае замоўленая або “святая” вада. Дысертант, засяроджваючы ўвагу на арганічным паяднанні ў тэкстах замоў язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў, звяртае ўвагу на ўстойлівасць захавання менавіта спрадвечнага матыву язычніцкага пакланення вадзе, яе шанавання, абагаўлення.

У трэцяй главе “Функцыянальны і аксіялагічны аспекты вобраза вады ў вуснай народнай творчасці” Я. А. Ненадаўцам вылучаны пяць параграфаў, змест якіх падпарадкаваны раскрыццю функцыянальнасці вобраза вады ў малых фальклорных жанрах, выяўленню яго аксіялагічных аспектаў, высвятленню вытокаў такой з’явы, як пакланенне святым крыніцам і калодзежам, аналізу народных вераванняў пра Дунай-раку, якая асэнсоўвалася як сакральная рака нашых продкаў і надзялялася адметнымі міфапаэтычнымі ўласцівасцямі.

Заслугоўваюць увагі меркаванні дысертанта адносна ўвасаблення вобраза вады ў малых фальклорных жанрах. Аўтар пераканаўча сцвярджае, што ў парэміях, якія ўяўляюць сабой звод народнай мудрасці, адлюстраваны звязаныя з вобразам вады рэаліі, якія характарызуюць як з’явы матэрыяльнай, так і духоўнай культуры беларускага народа. Я. А. Ненадавец даказвае, што занатаваныя ў прыказках і прымаўках сацыяльныя, маральна-этычныя і эстэтычныя ідэалы, а таксама прагматычная каштоўнасць народных уяўленняў пра ваду надзвычай важныя для разумення светапогляду беларусаў. Выбраныя дысертантам тэксты парэмій з вобразам вады – сведчанне глыбіні ўвасаблення ў іх змесце розных аспектаў, як, напрыклад, неабходнасць вільгаці для вядзення гаспадарчых работ, для спрыяння ўраджайнасці нівы, для забеспячэння дабрабыту. Аўтар звяртае ўвагу і на аналіз тых тэкстаў прыказак і прымавак, дзе семантыка вобраза вады з’яўляецца надзвычай актуальнай для асэнсавання агульначалавечых законаў жыцця і маральна-этычных норм.

Прыемныя ўражанні пакідае азнаямленне са зместам параграфаў, прысвечаных характарыстыцы “святых” азёр і крыніц у беларускім фальклоры, а таксама асэнсаванню вобраза Дуная. Заслугай саіскальніка з’яўляюцца выяўленыя ім уяўленні пра крынічную ваду (у лекавыя магчымасці яе верылі і далучалі крыніцы да ліку “святых”), а таксама ахарактарызаваныя аўтарам народныя вераванні пра Дунай, семантыка якога тлумачылася як “водная прастора ўвогуле, мора, мяжа паміж сваім і чужым светамі, дарога ў іншую зямлю, у другі свет” (с. 93).

Абагульненне вядомых даследаванняў пра адметнасці міфалагізацыі ракі Дунай і асэнсаванне фактычнага матэрыялу далі магчымасць дысертанту даць адказ на пытанне, чаму ў міфапаэтычным мысленні беларусаў гэта рака ўспрымалася як сакральная, выконвала сімвалічную функцыю мяжы паміж рознымі станамі і светамі.

У параграфе “Вобраз ракі-мяжы ў вуснапаэтычнай творчасці беларусаў” на аснове аналізу пазаабрадавых песень Я. А. Ненадавец выяўляе семантыку ракі як міфічнай дарогі ў іншасвет, як таго месца, дзе можна было дазнацца пра лёс героя, нарэшце як разумнай істоты (у іншасказальным значэнні), якая выконвае просьбу паміраючага воіна.

Да ліку станоўчых якасцей дысертацыйнага даследавання Я. А. Ненадаўца варта аднесці вялікую падрыхтоўчую працу па вывучэнні, сістэматызацыі і асэнсаванні фактычнага матэрыялу і тэарэтычнай літаратуры па абранай тэме, комплексны падыход да асэнсавання семантыкі, сімволікі і функцыянальнасці воднай прасторы ў беларускім фальклоры, імкненне доказна разгледзець семантыку воднай прасторы ў абраднасці выклікання дажджу, выявіць сімволіку вобраза вады ў радзінна-хрэсьбіннай і пахавальнай абраднасці і інш. фальклорных жанрах.

Пры ўсіх станоўчых момантах дысертацыйнага даследавання выкажам асобныя заўвагі-пажаданні:

1. У першым параграфе “Семантыка і знакавасць воднай прасторы ў сферы каляндарнай абраднасці” другога раздзела гаворыцца пра абрад выклікання дажджу. Хацелася б пачуць тлумачэнні саіскальніка наконт назвы параграфа (маецца на ўвазе выкарыстанне выразу “ў сферы каляндарнай абраднасці”.

2. Саіскальніку пры падрыхтоўцы ў будучым манаграфіі (паводле матэрыялаў дысертацыі) неабходна ўлічыць наступнае пажаданне: матэрыял са старонак 40 і 41 перанесці ў першы параграф другога раздзела (гаворка вядзецца пра матэрыялы, звязаныя з выкарыстаннем замоўленай вады падчас юр’еўскага абраду першага выгану жывёлы на пашу).

3. У раздзеле, прысвечаным малым фальклорным жанрам, на мой погляд, прыклады загадак, дзе мае месца вобраз вады, прыведзены ў невялікай колькасці. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: чым абумоўлена выкарыстанне загадак як ілюстрацый у меншай ступені? Прапаную дысертанту ўдакладніць, пра якія каштоўнасці, звязаныя з вадой і ўвасобленыя менавіта ў загадках ідзе размова?

4. У раздзеле, прысвечаным малым фальклорным жанрам, выкарыстаны таксама фразеалагізмы. Прапаную саіскальніку ўдакладніць, на якой падставе яны ўключаны ў змест параграфа.

5. У рабоце зрэдку сустракаюцца механічныя памылкі і стылёвыя недакладнасці (сс. 4, 6, 35, 38, 59, 67, 72 і інш.).

**4. Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

У дысертацыі дакладна вызначана мэта і акрэслены задачы даследавання. Навуковая дакладнасць вывадаў дысертацыі абумоўлена вялікім аб’ёмам фактычнага матэрыялу, архіўнага, апублікаванага і ўласна запісанага, а таксама старанным асэнсаваннем напрацовак беларускіх і замежных вучоных-фалькларыстаў. Выкарыстаныя ў рабоце метады палявых фальклорна-этнаграфічных даследаванняў (правядзенне інтэрв’ю з інфармантамі і метад уключанага назірання) дапамаглі забяспечыць

надзейную базу для атрымання самастойных вывадаў, прадстаўленых у главах дысертацыі і заключэнні.

**5. Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

*Навуковая значнасць вынікаў даследавання*.

Дысертантам упершыню ў беларускай фалькларыстыцы комплексна даследаваны народныя вераванні, звязаныя з вадой, воднай прасторай у кантэксце розных фальклорных жанраў.

*Практычная значнасць* Прапанаваная дысертацыя звязана з прыкладнымі даследаваннямі, практычная значнасць заключаецца ў магчымасці выкарыстання матэрыялаў пры выкладанні дысцыплін “Фалькларыстыка”, “Славянская міфалогія” “Культуралогія”, “Этналогія”, пры падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў па фалькларыстыцы і славянскай міфалогіі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

*Сацыяльная значнасць* вынікаў даследавання вызначаецца неабходнасцю захавання і папулярызацыі народнай спадчыны беларусаў, арганічную частку якой складаюць народныя вераванні, звязаныя з вадой, што знайшлі міфапаэтычнае ўвасабленне ў розных жанрах вусна-паэтычнай творчасці беларусаў.

Работа можа быць карыснай пры падрыхтоўцы лекцый для выступлення перад шырокай аўдыторыяй, пры падрыхтоўцы публікацый у сродках масавай інфармацыі з мэтай выхавання ў моладзі павагі да народнай спадчыны.

З задавальненнем буду выкарыстоўваць матэрыялы дысертацыйнага даследавання ў вучэбным працэсе ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” пры выкладанні дысцыплін “Фалькларыстыка”, “Славянская міфалогія” (курс лекцый чытаецца для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі), “Культуралогія”.

**6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання апрабіраваны на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях. Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі знайшлі адлюстраванне ў 26 публікацыях аўтара (10 артыкулаў у выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання дысертацыйных даследаванняў (4,1 аўт. арк.), 13 артыкулаў змешчаны ў навуковых зборніках і ў зборніках матэрыялаў канферэнцый (2,9 аўт. арк.), 1 кніжнае выданне (16 аўт. арк.), 2 раздзелы ў калектыўных манаграфіях (6, 2 аўт. арк.).

**7. Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Дысертацыя і аўтарэферат аформлены ў адпаведнасці з прад’яўляемымі патрабаваннямі.

**8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Прапанаваная дысертацыя сведчыць аб уменні аўтара працаваць не толькі з фактычным матэрыялам (сістэмна яго аналізаваць і абагульняць), але

і асэнсоўваць тэарэтычныя работы, аргументавана вырашаць пастаўленыя задачы, прафесійна прымяняць метады даследавання.

**9. Заключэнне**

Дысертацыя Я. А. Ненадаўца «Водная прастора ў беларускім фальклоры: семантыка, сімволіка, функцыянальнасць» з'яўляецца завершанай, самастойна выкананай навуковай працай па аднаму з прыярытэтных кірункаў фалькларыстыкі і адпавядае спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка і патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да дысертацыйных прац на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

У адпаведнасці з пп. 19, 20 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» Я. А. Ненадаўцу можа быць прысуджана вучоная ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.09 – фалькларыстыка за:

– распрацоўку канцэпцыі даследавання ўвасобленых у многіх жанрах беларускага фальклору народных вераванняў, звязаных з воднай прасторай;

– упершыню сістэмна праведзенае комплекснае даследаванне семантыкі і сімволікі воднай прасторы ў беларускай вусна-паэтычнай творчасці;

– высвятленне спецыфікі функцыянавання вобраза вады ў абрадзе выклікання дажджу і сямейнай абраднасці, чарадзейных казках, замовах, малых фальклорных жанрах, пазаабрадавых песнях;

– вызначэнне аксіялагічных аспектаў вобраза вады ў вуснай народнай творчасці беларусаў;

– выяўленне ролі народных вераванняў, звязаных з воднай прасторай і ўвасобленых у беларускім фальклоры, у фарміраванні міфалагічнага светапогляду продкаў.

Афіцыйны апанент
доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры рускай і сусветнай
літаратуры ўстановы адукацыі «Гомельскі
дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» В. С. Новак

Подпіс В. С. Новак
ЗАВЯРАЮ
Начальнік аддзела кадраў
установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны"
06.12.2023 О. Т. Зайцева

АДДЗЕЛ КАДРАЎ